Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(49), 2008

*УДК 947.6 “1648-1651”; 357; 355.312 – 057*

# Спробы афармлення казацкіх палкоў на Беларусі ў сярэдзіне XVII ст.

С. А. Чаропка

Казацка-сялянская вайна, якая ахапіла беларускія землі ў сярэдзіне XVII ст. стала важнай з’явай у айчыннай гісторыі. Нягледзячы на тое, што вайна з’яўляецца самым яскравым прыкладам сацыяльнай барацьбы на Беларусі, на жаль, шэраг важных яе момантаў дагэтуль застаюцца недастаткова распрацаванымі. У прыватнасці, у навуковай літаратуры адсутнічаюць даследаваннні, якія адлюстроўваюць працэсы паказачвання беларускага насельніцтва ў перыяд з 1648 па 1651 гг. У сувязі з гэтым, мэтай прадстаўленай работы з’яўляецца вывучэнне гэтага працэса і, як вынік, спробаў стварэння на Беларусі буйных атрадаў казацкага тыпу – палкоў. Даследаванне арганізацыі і структуры атрадаў мясцовых паўстанцаў у перыяд Казацка-сялянскай вайны, на думку аўтара, можа зацікавіць краязнаўцаў, настаўнікаў, вучняў, якія імкнуцца да вывучэння роднай мінуўшчыны на паглыбленым узроўні.

У айчыннай гістарыяграфіі з 90-х гг. XX ст. за падзеямі 1648-1651гг. замацавалася назва “антыфеадальная вайна”, якая замяніла тэрмін панаваўшы ў гістарыяграфіі савецкага часу – “вызваленчая вайна беларускага народа”. Аднак азначэнне “антыфеадальная вайна”, хаця і вызначае асноўны характар дзейнасці паўстанцаў, але не выяўляе ўсёй складанасці і шматпланавасці падзей 1648-1651 гг., яно звужае характарыстыку вайны, хавае палітычныя супярэчнасці выражаныя ў форме міжканфесійнай барацьбы ўнутры феадальнага лагеру. Падзеі 1648-1651 гг. мелі не толькі антыфеадальны характар, а таксама характар абарончай вайны ВКЛ супраць Запарожскага войска, якое, паводле ўмоў Збораўскага дагавора 1649 г., фактычна пераўтварылася ў аўтаномны рэгіён у складзе каралеўства Польскага. На тэрыторыі Беларусі ў 1648-1651 гг. адначасова праходзілі два цесна звязаные паміж сабой працэсы: вайна ВКЛ супраць украінскіх казакоў і грандыёзнае паўстанне мясцовага насельніцтва – сялян, мяшчан, а таксама пераважна праваслаўнай шляхты. З гэтай прычыны тэрмін “казацка-сялянская вайна” падаецца больш дакладным, таму што ў яго аснове ляжыць вызначэнне асноўнага зместу падзей, а не вузкая ацэнка іх характару.

Спробы вывучэння казацкага руху на Беларусі ў сярэдзіне XVII ст. ўжо прадпрымаліся ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Беларускія даследчыкі Л.А. Акіншэвіч і М.Аўсіевіч прысвяцілі гэтай праблеме некалькі артыкулаў [1]. Больш грунтоўна паказаны працэс арганізацыі палкоў казацкага тыпу ў ВКЛ у працах украінскіх гісторыкаў Д.Л. Пахілевіча і Ю.А. Мыцыка [2]. Аднак да сённяшняга дня комплекснай работы, якая б адлюстроўвала працэс паказачвання мясцовага насельніцтва і спробы арганізацыі мясцовых паўстанцкіх палкоў казацкага тыпу ў абазначаны перыяд няма. Дыскусійным дагэтуль з’яўляецца само пытанне аб існаванні ўласна беларускага казацтва.

Паўстанне Б.Хмяльніцкага на Украіне вясной 1648 г. спрыяла разгортванню на беларускіх землях ВКЛ, пераважна на памежных з каронным Украінай Палессі і Падняпроўі, паўстанцкага руху, які абагульніў у сабе прадстаўнікоў часткі беларускай праваслаўнай шляхты, значную частку беларускага мяшчанства і сялянства. Гэты працэс у 1648 г. быў трапна названы сучаснікамі падзей “паказачваннем” [3, с. 105].

У працэсе паказачвання беларускага насельніцтва прасочваюцца дзве цесна ўзаемазвязаныя тэндэнцыі: далучэнне мясцовага насельніцтва да ўкраінскіх казацкіх загонаў і фарміраванне на беларускіх землях ВКЛ уласных, але падкантрольных украінскім палкоўнікам атрадаў казацкага тыпу. Разам са стварэннем шматлікіх дробных паўстанцкіх атрадаў з канца лета 1648 г. на Беларусі актыўна ішоў працэс арганізацыі параўнальна буйных падраздзяленняў мясцовых паўстанцаў, якія ў сучаснай украінскай навуковай літаратуры часта ўзгадваюц-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ца пад назвамі Брагінскі, Мазырскі, Турава-Пінскі, Рэчыцкі і Палескі палкі [4]. Што ўяўлялі гэтыя палкі, ці можна іх лічыць казацкімі, на гэтае пытанне паспрабуем даць адказ ніжэй.

У жніўні 1648 г., у выніку паўстання гараджан, у Рэчыцы быў створаны атрад з мясцовых жыхароў, які налічваў ад 700 да 1,5 тыс. чалавек. [1, с. 103-106]. Паводле канфесаты (пратаколу допыту) палонных казакоў, кіраўніком рэчыцкіх паўстанцаў быў Пакусін. Гэты казацкі правадыр пазначаецца ў дакументах як палкоўнік, што ўскосна дае падставы меркаваць аб стварэнні мясцовага палка – буйнога атрада, які павінен быў мець пэўную структуру. Пасля бітвы пад Лоевам у палон да ўрадавага войска трапіў адзін з паўстанцаў – Ясько Трухамоўка, які на допыце даў цікавую інфармацыю. У 1648 напачатку – 1649 гг. ён быў сотнікам у Рэчыцы, што таксама ўскосна сведчыць аб наяўнасці структурнай арганізацыі рэчыцкіх паўстанцаў. Можна выказаць думку, што Рэчыцкі полк падзяляўся на больш дробныя падраздзяленні ўласцівыя казацкай вайсковай арганізацыі – сотні [5]. Пасля авалодання польным гетманам ВКЛ Янушам Радзівілам Бабруйскам Рэчыцкі полк як вайсковае падраздзяленне верагодна знік, таму што ў крыніцах узгадванняў аб ім выявіць больш не ўдалося. Магчыма адны паўстанцы склалі зброю, іншыя, найбольш актыўныя, адышлі на Украіну. Аб падобным сцэнарыі сведчыць лёс узгаданага паўстанца Я. Трухамоўкі, які на допыце паказаў, што ён "пасля ўзяцця Мазыра і Бабруйска, баючыся войска нашага (войска ВКЛ – С.Ч.)" пайшоў на Чарнігаўшыну і аказаўся ў складзе Чарнігаўскага палка [5]. Падчас свайго існавання з канца лета 1648 г да вясны 1649 г. Рэчыцкі полк не з'яўляўся цалкам самастойным баявым падраздзяленнем, ён знаходзіўся пад камандаваннем гетмана войска Запарожскага. Аб гэтым сведчыць накіраванне ў Рэчыцу Багданам Хмяльніцкім у жніўні-верасні 1648 г. казацкага палкоўніка Кемкі і наступная перадача камандавання палком у верасні-кастрычніку гэтага ж года сваяку Хмяльніцкага – палкоўніку Кізіму [3, с. 103-106, 161-163]. Да таго ж, палова асабістага складу гэтага палка, які налічваў да 3 тыс. чалавек, складалася з украінскіх казакоў. На допыце палонны казак асобна выдзеліў, што адна палова палка складалася з сялян, другая – з казакоў. Такім чынам можна зрабіць выснову аб тым, што Рэчыцкі полк быў буйным вайсковым фарміраваннем украінскіх казакоў і беларускіх паўстанцаў і знаходзіўся ў сістэме ўкраінскіх казацкіх паўстанцкіх палкоў пачатковага этапу вайны 1648-1651 гг.

Падобны да Рэчыцы працэс стварэння падраздзялення казацкага тыпу праходзіў і ў суседнім павятовым цэнтры. У жніўні 1648 г. паўстаўшыя жыхары Мазыра і наваколля стварылі атрад колькасцю 400-500 мясцовых паўстанцаў пад кіраўніцтвам мясцовага мяшчаніна Івана Столяра, які, паводле паказанняў палонных казакоў, таксама пазначаецца як палкоўнік. Арганізацыйна Мазырскі полк складаўся з некалькіх сотняў, адна з якіх прадстаўляла ўласна гараджан павятовага цэнтра, астатнія жыхароў наваколля. На чале асобнай мяшчанскай сотні стаў невядомы па імені сёдзельнік, якога ў крыніцах называюць мянушкай "Сядляр". Мазырскія паўстанцы мелі непасрэдныя сувязі з вышэйшым кіраўніцтвам украінскіх казакоў, у прыватнасці, ад Хмяльніцкага Сядляр атрымаў ліст, які даваў яму права набіраць людзей у мяшчанскі атрад [3, с. 104-106]. Звесткі аб дзейнасці мазырскіх паўстанцаў з верасня 1648 па люты 1649 г., на жаль, не выяўлены, але ў лютым 1649 г. мазыране зноў выходзяць на гістарычную сцэну, што звязана з падыходам да горада войска ВКЛ. Дакладная лічба паўстанцаў у горадзе ў гэты час на жаль, невядома, але з упэўненасцю можна сцвярджаць, што колькасць абаронцаў Мазыра дасягала некалькіх тысяч чалавек. Палонныя паўстанцы заяўлялі, што ў горадзе знаходзяцца некалькі дзесяткаў тысяч паўстанцаў, аднак гэтыя лічбы падаюцца надта завышанымі і не пацверджваюцца іншымі крыніцамі. Гарнізон абаронцаў складаўся з дзвюх частак: атрада ўкраінскіх казакоў пад кіраўніцтвам палкоўніка Міхненкі і ўласна атрада мазырскіх паўстанцаў. Верагодна восенню – зімою 1648 г., у кіраўніцтве паўстаўшых мазыран адбыліся нейкія змены, таму што, па звестках палоннага казака, у лютым 1649 г. на чале мазырскіх паўстанцаў быў ужо не Столяр, а Сядляр, Міхненка выконваў функцыі яго намесніка. Такім чынам, Мазырскі полк таксама з'яўляўся змешаным казацка-сялянскім падраздзяленнем. Адсутнасць звестак у крыніцах аб дзейнасці атраду мазыран пасля авалодання горадам Я.Радзівілам, а таксама вывучэнне ходу барацьбы на Беларусі ў 1649-1651 гг., дае магчымаць меркаваць, што Мазырскі полк, як і Рэчыцкі, аказаўся вельмі кароткачасовай з'явай у гісторыі Беларусі. Пачаўшы афармляцца ў жніўні 1648 г., ён быў знішчаны на пачатку люта-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

га 1649 г. Прыход з Украіны на Беларусь казацкага войска пад кіраўніцтвам І.Галоты ў чэрвені 1649 г. паспрыяў пачатку рэанімацыі Мазырскага палка, але разгром казакоў пад Загаллем перарваў гэты працэс.

Значную падтрымку ўкраінскія казакі атрымалі ад жыхароў Брагіна і Лоева. Напачатку восені 1648 г. украінскі гетман паставіў на чале паўстанцкіх сіл у ВКЛ свайго сваяка Кізіма, які камандаваў вялізным атрадам у 12 тыс. чалавек [3, с. 161-163]. Гэты атрад дыслацыраваўся каля Брагіна і складаўся, у тым ліку, з жыхароў наваколля. Выцясненне Радзівілам казацкіх загонаў з Беларусі зімой 1649 г. не прывяло да пераходу Брагіна пад кантроль шляхты і вясной 1649 г. пад горадам зноў збіраюцца значныя сілы паўстанцаў. Інфармацыі аб падзеях у брагінскім наваколлі няшмат, аднак, паводле фрагментарных звестак, удалося ўстанавіць, што ў красавіку 1649 г., у якасці брагінскага палкоўніка ўзгадваецца нейкі Макера (Мадэра**)**, пад камандаваннем якога было каля 6 тыс. паўстанцаў. Невядомы шляхціц паведамляе аб размяшчэнні гэтых паўстанцаў "у Лазаве і Брагіне" [6, с. 38]. Пад Лазавам верагодна разумеецца Лоеў, таму што аб знаходжанні ў Лоеве асобнага казацкага атрада ў чэрвені 1649 г. сведчыць стражнік ВКЛ Грыгорый Мірскі [7, с. 36]. Існаваўшая ў Лоеве сотня, верагодна, арганізацыйна ўваходзіла ў склад Брагінскага полка. Вядома імя ўзятага ў палон у красавіку 1649 г. брагінскага сотніка Феські, які, у залежнасці ад трактоўкі сэнсу крыніцы, або сам паходзіў з Лоева, або адтуль паходзіла яго сотня, якой ён кіраваў. [3, с. 38; 8, С. 162]. Пасля разгрому ў чэрвені 1649 г. казацкага войска Іллі Галоты пад Загаллем на чале Брагінскага палка стаў яго брат Грыгорый Галота, які паспрабаваў актывізаваць паўстанцкую дзейнасць на Мазыршчыне. Аднак заключэнне Збораўскага дагавора ў жніўні 1649 г. верагодна прывяло да роспуску Брагінскага палка, і на гэтым у час Казаца-сялянскай вайны ён спыніў сваё існаванне.

Фрагментарныя звесткі дазваляюць меркаваць аб тым, што працэс фарміравання падраздзялення казацкага тыпу ішоў таксама ў Гомелі. Паводле звестак палонных, у Гомелі летам 1648 г., як і ў іншых гарадах і вёсках Рэчыцкага і Мазырскага паветаў, "усе паказачыліся і паабяцалі адзін аднаму абараняцца да апошняга" [3, с. 105]. Палескі паход Радзівіла зімой 1649 г. не прывёў да пераходу Гомеля пад уладу шляхецкага войска, горад працягваў знаходзіцца пад кантролем мяшчан. Больш дакладныя звесткі аб гомельскіх паўстанцах адносяцца да сярэдзіны 1649 г. У ліпені гэтага года ў Гомелі знаходзілася 3 харугвы, сабраных з жыхароў наваколля, агульнай колькасцю каля 1 тыс. чалавек. У вывучаных падчас даследавання крыніцах не выяўлена ўзгадванняў аб існаванні гомельскага палка або палкоўнікаў, агульнае кіраўніцтва гомельскім гарнізонам належала чарнігаўскаму палкоўніку М. Нябабу. У сувязі з гэтым, можна выказаць думку аб тым, што гомельскі атрад у 1649 г. меў статус сотні ў складзе Чарнігаўскага палка.

У верасні 1648 г. узнік атрад мясцовых паўстанцаў у Тураўскай воласці. Дакладную колькасць тураўскіх паўстанцаў устанавіць вельмі складана, яна вагалася ў залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі. Ядро атрада складалі каля 400 чалавек, аднак у перыяд найвышэйшага ўздыму антыфеадальнай барацьбы колькасць паўстанцаў павялічвалася да 2 і больш тыс. чалавек, якія прадстаўлялі ў асноўным мясцовае сялянства і тураўскіх мяшчан [9, арк. 56]. Шляхціц А. Янкоўскі паведамляе, што паўстанцы выбралі "паміж сабой палкоўнікаў, сотнікаў, пісараў, атаманаў, асавул" [10]. На чале тураўскага атрада стаяў мешчанін Пракоп Цыўка, які, паводле допыту палонных паўстанцаў, называў сябе палкоўнікам тураўскім. Намеснікам "палкоўніцкім тураўскім" з'яўляўся Кандрат Цэўка [9, арк. 56]. Прыведзеныя дадзеныя даюць падставу сцвярджаць аб пачатку стварэння ўвосень 1648 г. вайсковай арганізацыі мясцовага сялянства і мяшчанства – Тураўскага палка. Лёс гэтага палка пасля падыходу ў лютым 1649 г. да Турава войска Радзівіла ў крыніцах выявіць не ўдалося. Частка паўстанцаў адышла на Украіну і там зліліся з украінскімі казацкімі загонамі, іншыя працягвалі барацьбу партызанскімі метадамі на Тураўшчыне.

Падобныя працэсы праходзілі і ў суседняй Давыд-Гардоцкай воласці. У кастрычніку 1648 г. мясцовыя жыхары "сабралі грамаду ў некалькі тысяч чалавек з воласці Гарадоцкай, узброіліся стэльбамі, шаблямі, рагацінамі, выбралі з іх ліку палкоўнікаў, сотнікаў на казацкі манер" [11]. У студзені 1649 г. у атрадзе налічвалася некалькі сотняў чалавек, якія складалі аснову падраздзялення. Палкоўнікам быў выбраны мясцовы войт І. Багдашэвіч, пры якім

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сфарміравалася паўстанцкая адміністрацыя з ліку гараджан і сялян. Прыведзеныя звесткі сведчаць аб стварэнні Давыд-Гарадоцкага казацкага палка мясцовых паўстанцаў. Звестак аб дзейнасці гарадоцкіх паўстанцаў пасля Палескага паходу Радзівіла не выяўлена, аднак полк верагодна працягваў сваё існаванне ў выглядзе шэрагу партызанскіх атрадаў [11].

Такім чынам, можна адзначыць, што падчас Казацка-сялянскай вайны на падкантрольных украінскім казакам беларускіх тэрыторыях ішоў працэс арганізацыі атрадаў мясцовых паўстанцаў па казацкаму тыпу, стварылася ваенная арганізацыя і структура камандавання. На чале атрада знаходзіўся палкоўнік, якому падпарадкоўваліся камандзіры сярэдняга звяна – есавулы і сотнікі, а таксама прадстаўнікі палкавой канцэлярыі – пісары. Прыведзеныя вышэй звесткі даюць падставы сцвярджаць аб тым, што на Беларусі ў 1648-1649 гг. ішоў працэс афармлення Брагінскага, Рэчыцкага, Мазырскага, Тураўскага, Давыд-Гарадоцкага палкоў. Аднак, гэтыя фарміраванні ні ў якім разе нельга лічыць у поўнай меры казацкімі. Створаныя на Беларусі палкі з’яўляліся выключна баявымі падраздзяленнямі, але ніяк не адміністрацыйнымі адзінкамі. Стварэнне полкава-соценнай сістэмы ў казацкай Украіне пачалося ўжо пасля выцяснення казакоў з тэрыторыі ВКЛ, таму яно не закранула беларускіх зямель, за выключэннем Брагіншчыны, якая ўваходзіла ў склад Кіеўскага ваяводства. Разам з тым, стварэнне паўстанцкіх палкоў казацкага тыпу не азначае аўтаматычна стварэння беларускага казацтва. У крыніцах дакладна праследжваецца падвоенасць асабістага складу палкоў: асобна выдзяляецца сялянскі кампанент, асобна – казацкая прысутнасць у тым або іншым падраздзяленні. Далучэнне селяніна да паўстанцкага палка не рабіла яго аўтаматычна казаком, не толькі на Беларусі, але і на Украіне. Па сутнасці, ён працягваў заставацца селянінам і надалей, толькі паступова ён мог пераўтварыцца ў казака – прафесійнага ваяра, для якога характэрны асаблівы іншы лад жыцця, іншыя заняткі, спецыфічны побыт і менталітэт. Працэс афармлення казацтва на Украіне працягваўся каля стагоддзя, таму за час Казацка-сялянскай вайны беларускае казацтва аформіцца проста не мела магчымасці. Беларускія паказачаныя паўстанцы імкнуліся ўспрыняць асноўныя ідэі, знешнія формы паводзін украінскіх казакоў, некаторыя паўстанцы ў наступным уліваліся ў шэрагі ўкраінскага казацтва, але заяўляць аб стварэнні ў разглядаемы перыяд уласна беларускага казацтва як асобнага элемента пакуль што падстаў няма. На жаль, недахоп інфармацыі не дазваляе больш падрабязна прааналізаваць працэсы, якія праходзілі на падкантрольных украінскім казакам тэрыторыях Беларусі, таму гэтае пытанне мае яшчэ патэнцыял для далейшага глыбокага даследавання.

**Abstract.** The paper presents the study of one of the aspects of socio-political struggle in Belarus in the period of 1648–1654. It shows that the Belarusian detachments were formed under the influence of the Ukranian Cossak regiments, but it did not lead to the appearance of the Belarusian Cossaks, because there were no proper conditions for that in Belarus.

### Літаратура

1. Акіншэвіч, Л. Казацтва на Беларусі: (Гіст.-юрыдычны нарыс) / Л. Акіншэвіч // Полымя. – 1927. – № 1; Авсиевич, М. Казаки на Беларуси / М. Авсиевич // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2005. – № 5. – С. 57-59.
2. Похилевич, Д.Л. Белорусское казачество / Д.Л. Похилевич // Наукові записки Львівського державного ун-та ім. Ів. Франка. – Т. XLIII. – Вип. 6. – 1957. – С. 145-172; Мицик Ю.А. Джерела з історії Національно-визвольної війни українського народу середини XVII ст.. – Дніпропетровськ: ВПОП “Дніпро”, 1996.
3. Документы об освободительной войне украинского народа 1648-1654 гг. – Киев: Наукова думка, 1965. – 825.
4. Сухіх, Л.А. Брагинський полк / С.А. Сухіх // Українсько козацьтво: Мала енциклопедія. – Київ, 2006. – С. 56; Пришляк, В.В. Турівсько-Пинський полк / В.В. Прышляк // Там жа. – С. 574; Мицик, Ю. Лоїв у роки Національно-визвольної війни українського народу1648-1658 рр. / Ю. Мицик // Гісторыя Лоеўскай зямлі. Факты. Каментарыі: матэрыялы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 500-годдзю ўтварэння г.п. Лоеў, Лоеў, 20 кастр. 2005 г. / Гомел. Дзярж. ун-т.; рэдкал.: С.А. Чаропка [і інш.]. – Гомель, 2006. – С. 30-34.

5. Канфесата допыту Я. Трухамоўкі // Львоўская навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Украіны (ЛНБ). – Аддзел рукапісаў. – Фонд Асалінскіх. – Спр. 225/II. – Арк. 249 аб. – 250.

6. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов: в 3 т. – Мн.: Изд-во Академии наук БССР, 1960. – Т.2. – 560 с.

7. Мицик, Ю. З нових документів про Національно-визвольну війну українського народу (1648-1658 рр.) на Сівірській Україні / Ю.Мицик. – Сіверянський літопис. – 1999. – №2. – С.12-17.

8. Воссоединение Украины с Россией. Документы и материалы в 3-х томах. – М.: Издат-во Акад.наук СССР, 1953. Т.2.

9. Канфесата палонных казакоў // ЛНБ. – Аддзел рукапісаў. – Фонд Асалінскіх. – Спр. 3882 – Арк. 55 аб.–56 аб.

10. Скарга А. Янкоўскага // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1329. – Арк 199-202.

11. Скарга князя М.С. Чацвярцінскага // НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4, Спр. 906 – Арк. 52-53.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 15.10.07

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ